Ялінкі, што сюды з лясоў прыйшлі.
Завецца **плошчай** Перамогі ў Мінску
**Мясціна** дарагая на зямлі.

*А. Астрэйка.*

Спішыце. Абазначце скланенне выдзеленых назоўнікаў.
Падкрэсліце словы з арфаграмай «Правапіс уласных назоўнікаў».
Вывучыце верш на памяць.
Раскажыце, чаму плошча Перамогі ў горадзе-героі Мінску дарагая кожнаму беларусу.

## § 32. Асаблівасці правапісу канчаткаў назоўнікаў 1-га скланення (у давальным і месным склонах адзіночнага ліку)

**202.** Прачытайце і адгадайце загадкі.

1. Без голасу, а вые, без рук, а абрусы сцеле. 2. Цякла, цякла і пад шкло лягла. 3. Сядзіць пані ў жупане*, хто жупан здзірае, той слёзы пралівае. 4. Сама пані ў каморы, а яе косы на двары. 5. У небе вата, а ў ёй вады багата. 6. Маленькага росту, прыгожага стану, хто яе знае, той розум мае.



Запішыце адгадкі. Выдзеліце канчаткі назоўнікаў. Ахарактарызуйце аснову кожнага назоўніка.

Праскланяйце ў адзіночным ліку па адным назоўніку з асновай кожнага тыпу. У якіх склонах назоўнікі маюць аднолькавыя канчаткі?

Склонавыя канчаткі назоўнікаў 1-га скланення залежаць ад характару асновы, а ў давальным і месным склонах — ад націску.

Апошнія зычныя асновы назоўнікаў 1-га скланення ў давальным і месным склонах на ***г, к, х*** чаргуюцца: ***г//з, к//ц, х//с***: *дарога — (па) дарозе, сцежка — (на) сцежцы, скруха* — (у) скрусе.*



Праваўладальнік Акадэмія адукацыі

**203.** Прачытайце табліцу. Аднавіце пачатковую форму назоўнікаў. Вызначце склонавыя канчаткі назоўнікаў, зрабіце вывад пра іх правапіс.

| Склон | Пытанне | Назоўнікі з асновай | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | **на цвёрды зычны** | **на зацвярдзелы зычны** | **на мяккі зычны** | **на *г, к, х*** |
| Д. | к а м у?<br>ч а м у? | *лісе́*<br>*бярозе*<br>*вясне* | *сястры*<br>*паліцы* | *Тані*<br>*яблыні* | *дарозе*<br>*вавёрцы*<br>*ткачысе* |
| М. | *аб (на, пры, па)* к і м?<br>*аб (на, пры, па)* ч ы м? | *(аб) лісе́*<br>*(на) бярозе*<br>*(па) вясне* | *(пры) сястры*<br>*(на) паліцы* | *(па) Тані*<br>*(на) яблыні* | *(на) дарозе*<br>*(аб) вавёрцы*<br>*(аб) ткачысе* |

Складзіце і запішыце па адным сказе з назоўнікамі кожнай групы, ужываючы назоўнікі ў форме давальнага або меснага склону.

**204.** Прачытайце тэкст. Вызначце тып маўлення. Абгрунтуйце сваё меркаванне.

У даўнія часы на бераз.. сіняга мора стаяў блакітны казачны горад.[сн] Жылі ў ім шчаслівыя людзі. Людзі ўсміхаліся сонц.., што шчодра пасылала цяпло зямл.. . Птушкі яшчэ весялей спявалі[ф] на дрэвах, радуючыся кожнай *(усмешка)*. Зялёныя лісточкі шчасліва трымцелі пад павевам лёгкага ветрыку. Удзень людзі працавалі і спявалі песн.., бо праца прыносіла ім задавальненне. А ўвечары людзі радаваліся *(музыка)*, што лілася з іх дам.. *(Паводле Г. Васілеўскай)*.

Спішыце тэкст, раскрываючы дужкі і дапісваючы канчаткі назоўнікаў. Падкрэсліце назоўнікі 1-га скланення, вызначце тып асновы.

**205.** Прачытайце тэкст. Спішыце, раскрываючы дужкі.

У адным Маркоўным *(царства)*, у Капусным *(гаспадарства)* на *(вуліца)* Бабовай жылі дзве сястрычкі — Моркаўка і Капустачка. Быў у іх меншы брат — Пакацігарошак. Сястрычкі ўвесь час у клопатах па *(гаспадарка)* дзень за днём праводзяць.

А Пакацігарошак з *(раніца)* да вечара па *(сцежка-дарожка)* на *(самакат)* катаецца. А каб дапамагчы адной ці другой *(сястрычка)* — *(Моркаўка)* або *(Капустачка)*, — пра гэта нават і не думаў! *(Паводле А. Бутэвіча).*

Падумайце, як развіваліся падзеі далей. Якім можа быць працяг казкі? Уявіце сітуацыю, калі Моркаўка і Капустачка звяртаюцца да Пакацігарошка і: 1) просяць у яго дапамогі па гаспадарцы; 2) павучаюць, як трэба ставіцца да сваіх абавязкаў. Раскажыце казку паводле адной з сітуацый. Якія формулы маўленчага этыкету вы будзеце выкарыстоўваць?

**206.** Запішыце словазлучэнні ў тры слупкі ў адпаведнасці з тым, з якім гукам чаргуюцца зычныя ў аснове на ***г, к, х***: [г] // [з’], [к] // [ц], [х] // [с’].

Ляжаць у *(сумка)*, аб’явіць падзяку *(ткачыха)*, плыць на *(крыга)*, дом пры *(дарога)*, трымаць у *(рука)*, радзімка* на *(шчака)*, быць у *(скруха)*, ісці па *(сцяжынка)*, радавацца *(вавёрка*[л]*)*, на каляровай *(дуга)* вясёлкі.

Знайдзіце слова, што мае значэнне ‘афіцыйная высокая ацэнка чыёй-небудзь работы’. Якія яшчэ значэнні мае гэта слова?
Падбярыце да яго аднакаранёвыя словы, разбярыце іх па саставе.

## § 33. Асаблівасці правапісу канчаткаў назоўнікаў 2-га скланення (у родным і месным склонах адзіночнага ліку)

**207.** Прачытайце тэкст. Вызначце яго асноўную думку. Падбярыце да тэксту загаловак.

Зіма — пара́ не толькі святкаванняў, але і **холаду** і прастуды. Засцерагчыся ад **грыпу** дапамогуць народныя рэцэпты.

Адным з самых галоўных сродкаў народнай медыцыны з’яўляецца **мёд**, які лечыць ад вялікай колькасці хвароб. Але самае галоўнае, што натуральны мёд — прыродны імунастымулятар. Маленькая лыжачка мёду нашча* і яшчэ адна, разведзеная ў шклянцы





Праваўладальнік Акадэмія адукацыі